ВЯРТАННЕ «ДАЎГОЎ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Каб гэтыя «лёгкія» дыхалі, так бы мовіць, на поўную моц, у Ельні плануецца ўзвесці больш за 50 каскадных плацін і перамычак на водаадводных каналах. Бо летась спецыялісты, якія з дапамогай мясцовых жыхароў правялі абследаванне балотнага масіву, высветлілі, што існуючыя перамычкі перастаюць выконваць сваё функцыянальнае прызначэнне, а іх колькасць відавочна недастатковая.

Падчас будаўніцтва выкарыстоўваецца вопыт і прымяняюцца тэхналогіі, што паспяхова зарэкамендавалі сябе пры рэкрэацыі балот у Ірландыі і Паўночнай Шатландыі. Новыя збудаванні вельмі важныя для захавання азёрна-балотнага комплексу «Ельня». Каб вярнуць балота ў ранейшы стан, трэба забяспечыць раўнамерны пад'ём узроўню вады.

Ельня — жамчужына беларускай прыроды.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Заказнік таксама здольны стаць цэнтрам міжнароднага экалагічнага і навуковага турызму. Ельня — важная транзітная пляцоўка для пералётных птушак, яна валодае неацэнным матэрыялам для назіранняў навукоўцаў, практычных работ студэнтаў замежных ВНУ, арнітолагаў-аматараў. Славіцца Ельня і сваімі дзікарослымі лекавымі травамі: у навакольных вёсках захаваліся сотні арыгінальных напояў і настояў, якія могуць стаць брэндам рэгіёна.

Безумоўна, у Мёрскім раёне ўлічваецца досвед работ па вяртанні ў былы стан іншых беларускіх балот. Напрыклад, у Чэрвеньскім раёне, які можна лічыць паказальным у плане паўторнага забалочвання асушаных тарфянікаў. Да маштабнага асушэння ў сярэдзіне мінулага стагоддзя гэтыя тарфянікі ўяўлялі сабой досыць прывабную экасістэму з разнастайным прыродным ландшафтам. Аднак бяздумнае ўмяшанне стала прычынай пажараў, самы моцны з якіх знішчыў амаль 30% тэрыторыі. У атмасферу трапілі тысячы тон парніковых газаў.

Паўторнае забалочванне стымулявала натуральнае аднаўленне парушанай экасістэмы.

Але паставім пытанне гранічна прагматычна: што атрымалі мясцовыя жыхары ад рэнатуралізацыі, кажучы навуковай мовай, балот у Чэрвеньскім раёне?

Як ні дзіўна, у першую чаргу — свежае і чыстае паветра. Раней у спякотныя дні рэгулярна адбываліся ўзгаранні сухіх тарфянікаў. І тады жыхары навакольных вёсак і нават райцэнтра былі вымушаны дыхаць едкім дымам, багатым на ўтрыманне выкідаў небяспечнага дыяксіду вугляроду. Балотныя пажары былі частай з'явай, асабліва ў засушлівыя гады. У раёне памятаюць пажары 1997, 1999, 2000 гадоў, калі гарэлі плошчы ў сотні гектараў. Вядома, гэта выклікала шмат скаргаў у насельніцтва...

Больш за пяць гадоў таму на балоце Галое пачаліся будаўнічыя работы па ўзвядзенні перамычак на меліярацыйных каналах. Сёння балота наблізілася да канчатковага адраджэння, што дазваляе мясцоваму насельніцтву зарабляць на зборы журавін і чарніц. У вялікім выйгрышу і мясцовая ўлада, бо прафілактыка тарфяных пажараў абыходзіцца нашмат танней, чым іх ліквідацыя. У выніку паўторнага забалочвання ўдаецца сэканоміць велізарныя грошы. Колькасць пажараў на такіх тэрыторыях значна скарачаецца, а значыць, няма неабходнасці ў выездах падраздзяленняў МНС. Сярод іншых выгод аднаўлення гідралагічнага рэжыму — падтрыманне ўзроўню грунтавых вод на прылеглых землях у міжсезонны перыяд, што спрыяльна ўплывае на вядзенне сельскай гаспадаркі.

Навесці парадак на зямлі — справа больш складаная і шматгранная, чым здаецца на першы погляд... Звычайна адразу ўзгадваюцца чыстыя пасёлкі і вёскі, добраўпарадкаваныя дарогі, дагледжаныя палі і фермы, лясы і ўзлескі без будаўнічага і дачнага смецця. Але калі браць шырэй, то паняцце «парадак на зямлі» ўключае ў сябе падтрыманне гармоніі з навакольным асяроддзем, стварэнне спрыяльных умоў для мясцовай фаўны і флоры, захаванне біяразнастайнасці. А гэта немагчыма без вяртання даўгоў прыродзе, у дадзеным выпадку — аднаўлення парушаных чалавекам балот і тарфянішчаў.

Чэрвень — Мёры.

ЗА ЧЫСТЫ МОТАЛЬ!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— Надта прыкра становіцца, калі агульны набытак не цэняць. Людзі могуць паламаць новую лаўку, папсаваць кантэйнер, паставіць машыну пры самай вадзе... Вынікі бескультур'я даводзіцца выпраўляць, і зноў гаварыць пра неабходнасць выхаваўчай работы.

> Вось і зараз у мясцовым гатэлі пражываюць італьянскія спецыялісты, якія прыехалі аказваць тэхнічную дапамогу аднаму з прадпрыемстваў Іванава.

Для гэтага, на думку Сяргея Піліповіча, трэба выкарыстоўваць любую магчымасць і найбольш працаваць з моладдзю. «Навучыць чалавека ўсведамляць сваё месца ў навакольным асяроддзі і сваю адказнасць аказалася задачай яшчэ цяжэйшай, чым знайсці сродкі і тэхніку для навядзення парадку на адным асобна ўзятым аб'екце», — заўважае Сяргей Мікалаевіч. Таму старшыня лічыць сваім абавязкам быць не рэдкім госцем у кожнай з трох школ сельсавета. Сёлета з вучнямі адзінаццатых і першых класаў Мотальскай школы кіраўнік мясцовай улады высадзіў елачкі на адной з вуліц аграгарадка.

За кожнай школай замацаваны кавалак вуліцы, які вучні падтрымліваюць у парадку. Пры гэтым сельвыканкам забяспечвае дзяцей аднаразовымі пальчаткамі, а прадпрымальнікі купляюць пакеты для смецця. Дзеці таксама ўдзельнічаюць у стварэнні вясковай наглядная агітацыі. Напрыклад, на вулічнай сметніцы можна заўважыць спецыяльны надпіс. Часцей за ўсё «Мы за чысты Моталь!» альбо больш разгорнуты лозунг: «Шлях смецця да кантэйнера пралягае праз нашу свядомасць. Будзь свядомым і не засмечвай!». Вучні не толькі збіраюць дробныя адходы ў ваколіцах школы, яны ўдзельнічаюць у творчых праектах па добраўпарадкаванні. (Так, навучэнцы школы мастацтва разам з педагогам Вольгай Калілец на бетоннай агароджы малочнатаварнай фермы побач з адным з уездаў у Моталь зрабілі цудоўную кампазіцыю).

Мотальскі сельсавет хоць і вялікі, але апарат сельвыканкама не адрозніваецца ад іншых. Таму райвыканкам праз упраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне вырашыў пытанне аб увядзенні дадатковай стаўкі рабочага па добраўпарадкаванні на перыяд з красавіка па верасень. А з пазабюджэтных сродкаў сельскі Савет узяў на працу летам яшчэ аднаго чалавека. Такім чынам удалося добра дагледзець вуліцы, газоны, а таксама пляжы і іншыя месцы адпачынку вяскоўцаў.

Калі трэба было, гэтыя рабочыя дапамагалі падкасіць ці прыбраць смецце на могілках. Варта сказаць, што месцы пахаванняў лічаць сваім клопатам усе пяць старастаў двух аграгарадкоў. Пяцёра могілак перададзены апошнім часам на баланс ЖКГ, але і людзі не застаюцца ўбаку.

А яшчэ старасты, паводле слоў старшыні сельскага Савета, праводзяць вялікую арганізатарскую работу: пераконваюць людзей выйсці на суботнік, прывесці ў парадак колькі метраў тэрыторыі насупраць сваёй хаты і ў сваім двары. Ёсць, на жаль, такія, каму трэба аб тым нагадваць... Але большасць жыхароў любіць і падтрымлівае парадак. Сельскі Савет штогод праводзіць конкурсы на найлепшы падворак сярод ветэранаў і маладых сем'яў. Здымкі пераможцаў змяшчаюцца на бачным месцы падчас святочных мерапрыемстваў, якія ў Моталі, як вядома, праходзяць з размахам.

Сёлета на цэнтральных вуліцах Моталя з'явіліся прыгожыя трох'ярусныя кветніцы, якія з вясны да восені радуюць яркімі фарбамі. Адно такое прыстасаванне каштуе тры мільёны рублёў. Купілі іх для роднай вёскі прадпрымальнікі — знешні выгляд свайго населенага пункта яны лічаць не чужой справай.

Зараз сельвыканкам працуе над праектам плана добраўпарадкавання на наступны год. Адным з пунктаў плана, магчыма, стане выраб паказальнікаў, якімі будуць абазначаны гістарычныя кварталы Моталя — раней жа мястэчка ўмоўна падзялялася на чатыры часткі. Сяргей Піліповіч мае задумку ўзнавіць іх назвы для нашчадкаў хаця б у арыгінальных знаках.

Добраўпарадкаванне — справа кожнага.

yackevich@zviazda.by

Іванаўскі раён.

«МАЛІНАВАЯ» ІДЭЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— Маліна каштуе дорага, — працягвае Жанна Чубса, — а на нашым поўдні краіны яна пачынае паспяваць на тры тыдні раней, чым у Гомельскім раёне, дзе яе даўно актыўна культывуюць. Мы хацелі б, каб наша прадукцыя была сертыфікавана. Улічваючы спецыфіку раёна, шукаем арганізацыю, якая б нас падтрымала. І тады зможам з чыстым сумленнем пастаўляць сваю прадукцыю на рынкі краіны і нават замежжа. Мы хочам, каб нам давяралі, бо Брагінскаму раёну дагэтуль даводзіцца пераадольваць наступствы міфаў і плётак пра радыяцыю.

Эфектыўным стаў і праект ПРААН па вырошчванні экалагічна чыстай гародніны. Выдаткаваныя Br70 млн задаволілі грамадзян, якіх сёння можна назваць паспяховымі фермерамі: яны прапануюць на рынку вялікі асартымент сваёй прадукцыі — ад радыскі і зеляніны да таматаў і баклажанаў.

Першыя вынікі ў выглядзе каштоўных ягад і грошай ад іх продажу прыносіць праект па вырошчванні буякоў. Святлана Сніцарэнка з вёскі Чамярысы атрымала пад новую культуру Br7 млн. Жанчына купіла 100 саджанцаў, якія вырошчвае па інавацыйных тэхналогіях, ужываючы кроплевы паліў і прытрымліваючыся ўсіх неабходных патрабаванняў да глебы.

Семінар па экалагічным землекарыстанні.

Частка ініцыятыў, якія падтрыманы замежнымі грантамі, прысвечана выключна гуманітарным напрамкам: здароваму ладу жыцця і экалогіі, развіццю традыцый і культуры, арганізацыі культурнага і сацыяльнага жыцця ў раёне. На Брагіншчыне рэалізуецца праграма па адкрыцці сямейных клубаў. Сёння іх шэсць, хутка стане восем.

Пры раённым музеі ёсць клуб «Натхненне». Тут занатоўваюць гісторыю Брагіншчыны. Даведаліся, напрыклад, што ў вёсцы Тэльман, дзе рэшткі замка Вішнявецкіх, ёсць камень кахання. Паводле падання, менавіта на гэтым месцы Лжэдзмітрый прызнаваўся ў каханні Марыне Мнішак. Удзельнікі гэтага праекта развіваюць і народны лялечны тэатр — батлейку. Цяпер рыхтуюць спектакль, які гледачы пабачаць на свята Раства.

На Брагіншчыне адкрыты клуб «Матулін ручнік». Гэты праект аб'ядноўвае людзей сталага ўзросту, якім ёсць што ўспомніць. Пенсіянеры збіраюцца разам, спяваюць, узгадваюць, а часам і дэманструюць унікальныя абрады, уласцівыя пэўнай мясцовасці. Летам у госці запрасілі сяброў з 15 раёнаў Гомельшчыны на вялікае мерапрыемства «Ад прадзедаў спакон вякоў», дзе разважалі пра духоўную спадчыну беларусаў.

Практычна ва ўсіх праектах выкарыстоўваліся не толькі сродкі замежных донараў, але і мясцовыя рэсурсы. Таму мяркуецца, што пачатыя ініцыятывы будуць дзейнічаць і развівацца.

iost@zviazda.by

Да канца 2017 года Еўрасаюз выдаткуе 5 млн еўра на рэалізацыю ў Беларусі сумеснага з ПРААН праекта па развіцці мясцовых ініцыятыў. На рэспубліканскі конкурс мясцовых ініцыятыў, праведзены нядаўна, было пададзена больш за 700 заявак ад арганізацый, выканкамаў, жыхароў... Найбольш заявак паступіла з Гомельшчыны.

«СЯМЕЙНЫЯ ХРОНІКІ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Мая цётка расказвала, якімі вясёлымі былі вечарыны. Збяруць некалькі яек і бягуць па гарманіста. Здымалі хату ў якой-небудзь бабулькі і да трох гадзін ночы гулялі. А раніцай трэба было ісці карову даіць, гнаць яе ў статак, а потым яшчэ і ў калгас бегчы, каб зямлі не пазбавілі...

Зараз старшыня сельскага Савета сама можа расказаць шмат цікавага. Працаваць пачынала яшчэ пры Савецкім Саюзе, стаж дэпутацкай дзейнасці — больш чым 30 гадоў. У 1982-м, калі толькі прыйшла ў Васькавіцкі сельсавет, дэпутацкія мандаты мелі аж 35 чалавек, а колькасць насельніцтва даходзіла да 2,5 тысячы. Пасля чарнобыльскай аварыі пачаўся адток жыхароў. Некаторыя з'язджалі сем'ямі. Значна зменшыўся і дэпутацкі корпус. Замест 70 у раённым Савеце засталося 35, а ў сельсавеце наогул 11.

— Але ж спраўляемся, — усміхаецца старшыня. — Тэрыторыя па памерах тая ж, што і раней, а насельніцтва значна паменела, ды і тыя паасобку жывуць. Магчыма, таму зараз такая цікавасць да радаводаў — людзі хоць так імкнуцца адзін да аднаго. Ад каранёў нельга адрывацца.

«Мяне хрысцілі ўпотайкі»

Пра сваіх продкаў Плехава ніколі не забывалася, але да пары трымала ўсё ў галаве. Зараз задумалася над тым, што трэба ўсё сістэматызаваць і аформіць у выглядзе сямейнага дрэва. Бо чым больш праходзіць часу, тым менш застаецца ў памяці цікавых фактаў. Калісьці іх узгадвала маці, але ўжо 10 гадоў мінула, як яе няма. Адзін за адным пайшлі з жыцця дзядзькі, цёткі. Хочацца, каб памяць пра іх таксама захавалася. Бо ўжо выраслі дзеці і нарадзіліся ўнукі. Яны павінны ведаць продкаў.

Пакуль існуе чарнавы варыянт радаводу. Засталося знайсці хвілінку вольнага часу, каб сесці за стол і ўсё раскласці па палічках, гэта значыць, па галінках.

— На жаль, далёка паглыбіцца не атрымалася, але я добра ведаю сваіх прадзедаў і прабабак, — паказвае яна ліст паперы, дзе размашыстым почыркам запісаны слупкі імёнаў. — Вось лінія маці. Яе бацька Пётр Фролавіч Цвярдоўскі загінуў на фронце, а маці — Соф'я Іванаўна — памерла ў жніўні 45-га. Падчас жніва разгарачаная папіла ледзяной вады, захварэла і хутка згарэла. Мая маці, Ганна Пятроўна, засталася ў сям'і за старэйшую, і на яе плечы лягло выхаванне трох малодшых сясцёр. Потым сваіх дзяцей гадавала. Наша сям'я была шматдзетнай — у мяне дзве сястры і два браты. Раней нараджалі па 5-6 дзяцей. Не тое, што цяпер. У мяне, як і ў сясцёр з братамі, толькі двое дзяцей.

У сямейных хроніках захавалася гісторыя пра дзеда Герасіма — незаконнанароджанага хлопчыка з сям'і Анісіма і Вінадоры Кузьміных, бацькавых продкаў. Адна з пяці іх дачок нарадзіла ў дзеўках, і, каб ганьба не запляміла рэпутацыю вялікага сямейства, Анісім запісаў Герасіма на сваё імя. Ён быў багаты чалавек, меў шмат зямлі і грошай, нават наймаў работнікаў, каб яны апрацоўвалі гэтыя надзелы. Лёс незаконнанароджанага склаўся вельмі ўдала. За яго сасваталі гарадскую нявесту з сям'і старасты, які, акрамя іншага, спяваў разам з усімі сваімі дочкамі ў царкоўным хоры. Адна з дачок старасты — Марыя — была ў Слаўгарадзе наогул знакамітая асоба: у савецкі час хрысціла дзяцей. Зразумела, рабіла яна гэта цішком. Быў выпадак, калі па дарозе ў вёску Кліны да знакамітай сёння на ўвесь белы свет Блакітнай крыніцы яе сфатаграфавалі для «дошкі ганьбы».

— Тым не менш ахвотных хрысціць сваіх дзяцей у яе было шмат, — згадвае Аляксандра Плехава. — Мяне яна таксама хрысціла. У яе быў вялікі крыж, яна здзяйсняла над намі абрад і чытала малітвы.

Архівы сельсавета

Апошнім часам у аматараў складаць радаводы сталі набываць папулярнасць так званыя пагаспадарчыя кнігі. У савецкія гады яны былі ва ўсіх вёсках, па іх вёўся ўлік насельніцтва, свойскай жывёлы, пладова-ягадных дрэў, зямельных участкаў. Там пазначалася інфармацыя па кожным члене сям'і — год нараджэння, адукацыя, месца працы. Па гэтых кнігах органы выканаўчай улады складалі справаздачнасць і вялі фінансава-гаспадарчую дзейнасць.

Аляксандра Плехава дэманструе цэлую бібліятэку такіх кніг. «Даваенныя, на жаль, не захаваліся. Слаўгарадскі раён перажыў дзве акупацыі, праз яго двойчы праходзіў фронт. Але ў нас ёсць кнігі, пачынаючы з 1949 года. У адной з іх знайшлася інфармацыя і пра маю маму, калі яна яшчэ была Цвярдоўская».

Тым, хто ў пошуках сваіх каранёў звяртаецца ў сельсавет, даюць пагартаць гэтыя кнігі. Неяк прыязджаў 40-гадовы жыхар з аграгарадка Ржаўка. Яму вельмі пашчасціла з карыснай інфармацыяй пра свой род. Ён усё сфатаграфаваў і паехаў дадому задаволены.

— Але галоўная каштоўнасць пагаспадарчых кніг у тым, што яны даюць магчымасць людзям вырашыць нейкія праблемы, — адзначае старшыня. — Пасля Чарнобыля, напрыклад, Кульшыцкі сельсавет быў цалкам адселены. Яго функцыі і ўсе дакументы перайшлі да нас. Людзі часцей звяртаюцца па даведкі аб месцы жыхарства на момант аварыі. А жыхарам іншых краін, якія нарадзіліся тут і жадаюць вярнуцца, з нашай інфармацыяй прасцей атрымаць грамадзянства.

Тыя самыя пагаспадарчыя кнігі.

Перад тым, як развітацца, старшыня паказала мне свой дом, дзе нарадзілася. Пабудаваны ён быў аж у 1918 годзе. Там ніхто не жыве, толькі на лета сястра прыязджае. А вось знесці яго рука не падымаецца, таму і грошай на рамонт не шкада. З ім не адна сямейная гісторыя звязана. Дзед працаваў дарожным рабочым і няблага зарабляў, а дом будаваў з такім разлікам, што сям'я будзе вялікая. «4 дачкі — гэта яшчэ не мяжа», — казаў ён. Але пачалася вайна, з якой дзед ужо не вярнуўся. Немцы ж з дома канюшню зрабілі, а пасля таго, як вёску вызвалілі, маці Аляксандры Плехавай, тады яшчэ зусім дзяўчынка, там кішэнны залаты гадзіннік знайшла. Нямецкі. Сям'я памяняла яго на адрэз тканіны...

Нэлі ЗІГУЛЯ. *zigulya@zviazda.by*

Фота аўтара.

ШТО НА СПРАВЕ?

ПРАДСТАЎНІК ДЗЯРЖАВЫ — НЕ «ВЯСЕЛЬНЫ ГЕНЕРАЛ»

Паўнамоцтвы ёсць, але як імі карыстаюцца?

Наяўнасць на балансе акцыянерных таварыстваў аб'ектаў, якія не выкарыстоўваюцца, вядзе да значных затрат на іх утрыманне. Абласны Савет дэпутатаў мае права ў 5 разоў павялічыць для такой маёмасці падатак на зямлю.

Аб гэтым прадстаўнікоў дзяржавы ў акцыянерных таварыствах папярэдзілі на сумеснай калегіі Камітэта дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці і фонду «Гроднааблмаёмасць».

Дзяржава з'яўляецца такім жа акцыянерам, як і іншыя ўдзельнікі таварыства. Аднак, улічваючы наяўнасць у ААТ значнай долі акцый, што належаць дзяржаве, менавіта ад яе прадстаўніка залежыць прыняцце канкрэтных рашэнняў па пытаннях работы прадпрыемства, з бачаннем перспектывы яго развіцця. Аднак...

— Як паказаў аналіз, функцыі прадстаўнікоў дзяржавы зводзяцца да прыняцця рашэнняў па размеркаванні прыбытку, выплаце дывідэндаў і прэмій і зацвярджэнні справаздач, — кажа **старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці Васіль ГЕРАСІМАЎ**.

У той час, як адзін з галоўных абавязкаў прадстаўніка дзяржавы — гэта абарона эканамічных інтарэсаў дзяржавы ў ААТ, забеспячэнне яго эфектыўнай работы. А што на справе?

— Калі кіраўнік прадпрыемства па «поўнай праграме» адказвае за стратнасць, любое пагаршэнне вытворчых паказчыкаў, то прадстаўнікі дзяржавы застаюцца ў баку, — зазначыў Васіль Герасімаў.

Многія з іх, па сутнасці, самаўхіліліся ад вырашэння праблем прадпрыемстваў — мэтанакіраванай работы па разгрузцы складскіх запасаў, пашырэнні рынкаў збыту прадукцыі, уцягненні ў гаспадарчы абарот маёмасці.

Дарэчы, па стане на 1 лістапада сёлетняга года акцыянерныя таварыствы з доляй уласнасці Гродзенскай вобласці ў статутных фондах прадалі маёмасці, што не выкарыстоўвалася, на суму 4,6 мільярда рублёў. Аднак многія аб'екты па-ранейшаму чакаюць новых гаспадароў. Як паскорыць гэты працэс? На калегіі прапанавалі прымяняць да аб'ектаў ААТ (з доляй дзяржавы больш за 50%) такія ж падыходы, як і да аб'ектаў дзяржаўнай уласнасці — з іх уключэннем у адпаведныя графікі, рашэннямі мясцовых органаў улады і кантролем за ўцягненнем маёмасці ў гаспадарчы абарот.

Сродкі ад продажу такіх аб'ектаў ААТ, у адрозненне ад дзяржаўнай маёмасці, паступаюць на рахункі прадпрыемстваў.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

prakopchik@zviazda.by

Для даведкі:

На тэрыторыі Гродзеншчыны дзейнічаюць 163 ААТ з доляй дзяржавы, у тым ліку 121 — з доляй камунальнай уласнасці вобласці і раёнаў. Дзяржава ўдзельнічае ў кіраванні гэтымі прадпрыемствамі праз сістэму сваіх прадстаўнікоў.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказная за выпуск КАРПЕНКА Н.У.

Грамадскі савет: **ГЕРАСІМОВІЧ С.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **АСКЕРКА Ю.В.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **НАВУМЕНКА А.В.**, старшыня Нараўлянскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН: 292 44 12;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 20.035. Нумар падпісаны ў 19.30 8 снежня 2015 года.